## Лукаш Іосіфавіч Галамбёўскі (1773, Пінскі р-н – 1849), польскі гісторык, этнограф, архівіст



Лукаш Іосіфавіч Галамбёўскі - польскі гісторык, этнограф, архівіст. Нарадзіўся ў вёсцы Пагост 13 кастрычніка 1773 года. У Дубровіцы (зараз раённы цэнтр на Украіне) скончыў манаскую школу, потым працаваў бібліятэкарам у вядомага гісторыка Т. Чацкага.

Ён удзельнічаў у паўстанні пад кіраўніцтвам Касцюшкі ў 1794 годзе. У адным з баёў Лукаш Галамбёўскі быў кантужаны. Прымаў удзел у абароне Варшавы, пасля падзення якой вярнуўся на ранейшую службу.

У той час, калі Галамбёўскі працаваў у Чацкага, яму вельмі спадабалася калекцыя кніг, але яна была прададзена Чартарыйскім у Пулавы. Ён едзе туды і з 1818 па 1823 – бібліятэкар у Пулавах. Тут Лукаш Іосіфавіч займаўся перакладамі, наладзіў сувязі з замежнымі архівамі - адным словам, пачаў займацца навуковай дзейнасцю.

У 1818 годзе яго актыўная дзейнасць была заўважана і ён выбіраецца сапраўдным членам таварыства сяброў навук. Праз некалькі гадоў пераехаў у Варшаву. Тут ён становіцца сакратаром (1824-1831) гэтага таварыства. З 1827 года прафесар літаратуры педагагічнага інстытута.

У 1831 працаваў бібліятэкарам Публічнай бібліятэкі Варшаўскага універсітэта і адначасова выкладаў там курс бібліяграфіі. Аўтар адной з першых прац па гісторыі Варшавы “Гісторыка-статыстычнае апісанне горада Варшавы” (1826).

У 1830 годзе Лукаш Галамбёўскі выпускае кнігу “Люд польскі, яго звычаі, забабоны”, дзе змяшчае апісанні вяселля, радаўніцы, іншых абрадаў, адзення і звычаяў беларусаў, узятыя з прац З.Даленгі-Хадакоўскага, М.Чарноўскай і іншых. У наступным годзе выйшла яшчэ адна яго кніга “Гульні і забавы розных саслоўяў ва ўсім краі або ў некаторых толькі правінцыях”. У кнізе ён апісаў побыт, абрады, адзенне, народныя святы і фальклор розных этнічных груп: палякаў, беларусаў, рускіх, украінцаў і літоўцаў. У гэтай кнізе ўпершыню апісаў унікальны абрад “куста”, які бытаваў на абмежаванай тэрыторыі Піншчыны (увайшло ў том БНТ “Гульні, забавы, ігрышчы”, 1996). Блізкае Галамбёўскаму пінскае Палессе прадстаўлена дажынкавай песняй, якую трэба лічыць адной з першых публікацый такога жанру. У том БНТ “Земляробчы каляндар” (1990) уключаны яго апісанні беларускіх абрадаў Сёмухі і Дажынак.

Апублікаваў забаўлянку “Сарока-варона”, легенды пра папараць-кветку, ноты беларускай купальнай і русальнай песень.

Здавалася б, што Лукаш Галамбёўскі ўладкаваў сваё жыццё, знайшоў працу па душы. Але ён стаў сведкам таго, як знішчаліся набыткі таварыства сяброў навук. Гэта яго псіхічна і маральна зламала. Ён спрабаваў прыхаваць некаторыя каштоўнасці з музейных калекцый, якія вывозіліся з роднага краю.

За гэта Галамбёўскі быў вызвалены ад пасады сакратара таварыства. У 1833 годзе ён пакідае Варшаву і пераязджае ў пасёлак Казіміраўка пад Грубешавам.

У апошнія гады свайго жыцця Лукаш Галамбёўскі напісаў такія значныя творы, як "Кабінет польскіх медалёў з часу панавання Станіслава Аўгуста" у 4-х тамах, "Гісторыя Польшчы" у 3-х тамах. Над "Гісторыяй Польшчы" ён працаваў у 1846-1848 гадах. Пісаў пераважна на польскай мове, прытрымліваўся кансерватыўных поглядаў.

Памёр Лукаш Іосіфавіч Галамбёўскі 7 студзеня 1849 года ў пасёлку Казіміраўка. Пасля яго яшчэ засталося каля 40 ненадрукаваных рукапісаў.

У гонар Лукаша Галамбёўскага на радзіме ў вёсцы Пагост-Загародскі ўстаноўлена мемарыяльная дошка.


1. **Golębiowski Lukasz.** Yry i Zabawy różnych stanów w kraju calum, lub niektórych tylko prowincyach. Warszawa, 1831. S. 185-186, 270.

2. **Саламевіч, І.У.** Галамбёўскі Лукаш Іосіфавіч / Саламевіч, І.У. // Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. / рэдкал.: Г.П.Пашкоў і інш. Мінск, 1997. Т. 4. С. 449-450.

3. **Саламевіч, І.У.** Галамбёўскі Лукаш Іосіфавіч / І.У.Саламевіч // Беларускі фальклор: энцыклапедыя: у 2 т. Мінск, 2005. Т.1. С. 320-321.

3. **Саўчанка, М.Л.** Лукаш Галамбёўскі – гісторык, архівіст, этнограф / М.Л.Саўчанка // Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Пінскага раёна. Мінск, 2003. С.120, 544-545, 566.

4. **Галамбёўскі** Лукаш (13.10.1773-7.01.1849) // Асветнікі зямлі Беларускай: энцыкл. даведнік / рэдкал.: Г.П.Пашкоў і інш.; маст. У.М.Жук. Мінск: БелЭн, 2001. С.104.

5. **Бандарчык, В.К.** Галамбёўскі Лукаш / В.К.Бандарчык // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. / Беларус. Энцыкл.; рэдкал.: Б.І.Сачанка (гал. рэд.) і інш.; маст. Э. Э. Жакевіч. Мінск, 1994. Т.2. С. 453.

6. **Васілевіч, У.А.** Лукаш Галамбёўскі / У.А.Васілевіч // Каханоўскі Г.А. Беларуская фалькларыстыка: Эпоха феадалізму / Г.А.Каханоўскі, Л.А.Малаш, К.А.Цвірка. Мінск, 1989. С.61-64.

7. **Саўчанка, М.** Лукаш Галамбёўскі – гісторык, архівіст, этнограф / М.Саўчанка // Полесская правда. 1991. 16 июля.